# СКЛОНАВАЯ ПАРАДЫГМА НАЗОЎНІКАЎ У СЛУЦКІМ ЕВАНГЕЛЛІ (XVI СТ.)

***Ярмоленка Эльвіра Валер'еўна***, *кандыдат філалагічных навук, навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

Назоўнік як часціна мовы характарызуецца граматычнымі катэгорыямі роду, ліку і склону. Вядома, што ў старажытнасці назоўнікі вылучаліся складанай сістэмай скланення, у якой падзел на тыпы адбываўся не паводле прыкметаў роду, а паводле характару асноў (назоўнікі размяркоўваліся па пяці тыпах іменнага скланення). Развіццё граматычнага ладу мовы прывяло паступова да істотных зменаў. Як адзначаюць даследчыкі, ужо ў ранніх пісьмовых помніках назіраецца ўзаемадзеянне паміж асобнымі тыпамі скланення, вынікам чаго стала з'яўленне варыянтных канчаткаў адных і тых самых формаў.

Мы разгледзім склонавыя канчаткі адзіночнага і множнага ліку назоўнікаў, зафіксаваных у Слуцкім Евангеллі.

**І. Адзіночны лік.**

Назоўнікі мужчынскага роду ў назоўным склоне аформлены з дапамогай нулявога канчатка: съходѧщь ꙗко голоубь; пристоупль к немꙋ искоуситель; исцѣлѣ ѡ*т*рокь ѡ*т* часа того. Сустракаюцца ўласныя імёны з канчаткам -*о*: бѣ оубо съи марко, петроу оучнкъ. Падобныя формы былі характэрныя для жывой народнай мовы, у рэлігійным пісьменстве яны ўжываліся даволі рэдка [1, с. 15]. Назоўнікі мужчынскага роду з былой асновай на *а* ўжываюцца з канчаткам -*а*: юноша нѣкы*и* пристоупи къ ісоу.

Назоўнікі ніякага роду ў назоўным склоне выступаюць з традыцыйнымі канчаткамі -*о*/-*е*: тоу боудеть и ср*д*це ваше; древо посѣкаемо бываеть, але: приближи бо сѧ цр*с*твѡ нб*с*ное; приближисѧ цр*с*твіе бжие.

Назоўнікі жаночага роду ў назоўным склоне зафіксаваны з канчаткамі -*а*/-*я*: хороба приближаласѧ; вѣра твоа спсе тѧ. У традыцыйнай для царкоўнаславянскай мовы форме ўжываецца назоўнік жаночага роду з асновай на зычны *дщи*: дщи моѧ нннѣ оумрть.

У родным склоне назоўнікі мужчынскага роду традыцыйна ўжываюцца з канчаткам -*а*/-*я*: мьзды не имате ѡ*т* ѡца вашего; въстав же іѡсиѳъ ѡ*т* сна; бѣжати ѡ*т* грѧдоущаго гнѣва; ѡ*т* каменіа сего въз*д*вигноути; не творить плода добра; ѡ*т* кваса фарисѣиска. З канчаткам -*у* зафіксаваны назоўнік *домъ* (з былой асновай на *и*): изше*д* ісъ из домоу.

Назоўнікі ніякага роду ў родным склоне таксама аформлены з дапамогай -*а*: Не стѧжите ѕлата ни сребра. З канчаткам -*а* выступаюць таксама і назоўнікі з мяккай асновай: ѡ*т* хта възнесеніа; знаменіа ищеть.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Назоўнікі з былой асновай на зычны *н* зафіксаваны з канчаткам -*и*: боудете ненавидими всѣми имени моего ради. Архаічны канчатак -*е* характэрны для назоўнікаў з былой асновай на зычныя *с* і *т*: знаменіа съ нбсе показати и*м*; искати ѡтрочате.

У родным склоне назоўнікі жаночага роду выступаюць з канчаткам -*ы*/-*и*: мъзды не имате ѡ*т* ѡца вашего; рыбы просить; съше*д*шоу же емоу съ горы; Не стѧжите … мѣди; съхрани*х* ѡ*т* юности моеѧ. У стараславянскай і старажытнарускай мовах назоўнік *земля* ў родным склоне ўжываўся з канчаткамі -*и* і -ѣ. У Слуцкім Евангеллі ён паслядоўна выступае з канчаткам -*и*: вы есте соль земли; снъ чл҃чьскый въ ср*д*ци земли.

У давальным склоне назоўнікі мужчынскага роду зафіксаваны з канчаткамі -*у* (-*оу*, -*оꙋ*)/-*ю* і -*ови*/-*еви:* осанѕна сноу дв*д*воу; сътвори бракъ сноу своемоу; помолисѧ ѡцоꙋ твоемꙋ; врази члкоу домашнѣи его; пѡ*д*обное львоу; пѡ*д*обьное же телцоу; съ дѣлатели по пѣнѧѕю. Канчатак -*ови*/-*еви* пашыраўся ў старабеларускай пісьменнасці ў выніку ўзаемадзеяння назоўнікаў з асновай на *о* з назоўнікамі з асновай на *и*, пераважаў у назоўніках са значэннем асобы і ва ўласных імёнах. Аднак у рэлігійных помніках канчатак -*ови*/-*еви* ўжываўся абмежавана. У Слуцкім Евангеллі ён ўжываецца даволі актыўна: покажисѧ іерѣови; рече къ ісови; кесарева, кесареви, и бжіа бгови. Маюць месца варыянтныя афармленні давальнага склону адных і тых самых назоўнікаў: рече петрови і бѣ оубо съи марко, петроу оучнкъ.

У давальным склоне назоўнікі ніякага роду выступаюць з канчаткамі -*у*/-*ю*: оучили есмы моужьствоу ... цѣлом*д*рию. З канчаткам -*у* зафіксаны і назоўнік ніякага роду з былой асновай на зычны *с*: Свѣтилѕникъ тѣлоу е*с* око. Як адзначаюць даследчыкі, для старабеларускай мовы старажытныя формы на -*и* з захаваннем суфікса -*ес*- не былі характэрныя [1, с. 33].

Назоўнікі жаночага роду ў давальным склоне выступаюць з канчаткамі -ѣ (з цвёрдай асновай) і -*и* (з мяккай асновай): тъкмо прикосноусѧ риꙁѣ его; прилѣпитсѧ къ женѣ своей; пріидоша … къ горѣ; Ѩко земли содомьстѣи ѡ*т*ра*д*нѣе боуде*т*; оучили есмы моужьствоу м*д*рости.

Афармленне вінавальнага склону назоўнікаў мужчынскага роду залежыць ад катэгорыі адушаўлёнасці. Назоўнікі са значэннем асобы маюць форму, аднолькавую з формай роднага склону: сатаноу изгонити; погребьсти ... мртвеца; предасть же бра*т* брата на смерть. Формы вінавальнага склону неадушаўлёных назоўнікаў супадаюць з формамі назоўнага склону: посла ихь въ виноградъ свои; възми свои одръ, і иди въ домъ твои; въ ѡгнь вмѣтаемо.

Назоўнікі ніякага роду ў вінавальным склоне маюць формы, аднолькавыя з формамі назоўнага склону: предасть же … ѡць чѧдо; члкь, иже има*т* овчѧ едино; видѣша отроча съ мриею; поими отрочѧ; ѡбрѧщета ослѧ привѧзано и жре*д*ѕбѧ; лихо творите; ити въ стадо свиное; вымѣтающа мрежоу въ море; крщаю … въ покааніе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У вінавальным склоне назоўнікі жаночага роду прадстаўлены 1) з канчаткам *-у/-ю* (з былой асновай на *а*): оузрѣвъ смоковницоу; врьзите въ тмоу кьромѣшнюю; пшеницоу съберите въ жит҃ницѫ мою; възшед на горѫ; ѕмию подас емоу; дшю же не могоущих оубити; иди в землю; вьмѣтающа мрежоу въ море; 2) з нулявым канчаткам (форма вінавальнага склону супадае з формай назоўнага склону): вниде въ клѣть свою; вьниде въ црковь бжію. Назоўнікі *мати* і *дщи* зафіксаваны ў вінавальным склоне з канчаткам *-е*: любить сна, или дъщере паче мене; оставит матере.

У творным склоне назоўнікі мужчынскага і ніякага роду зафіксаваны з канчаткамі *-омъ/-емъ*: сѣдших дроугъ съ дроугомь; съ зеведеѡм ѡцемь; сьмирисѧ съ братом твоимь; възлежахоу съ ісомъ и съ оучникы его; соуд ѩзыкѡм възвѣстить; видѣ тещоу его лежащоу і огнем жьгомоу; кротокъ есмь и смѣрень срьд҃цемь; пред лицем твоим҃. Назоўнікі ніякага роду з былой асновай на зычны *н* захоўваюць суфікс *-ен-:* именем іосиѳъ. Назоўнікі з былой асновай на *с* зафіксаваны без суфікса *-ес-:* единѣм окѡм въ животь в҃нити; ѡбльстѧть его словѡм҃.

У творным склоне назоўнікі жаночага роду аформлены з дапамогай канчатка *-ою/-ею:* съ клѧтвою изрече; крсщаю вы водою; множицею бо падаеть въ огнь. Шырока ўжываюцца формы з канчаткам *-ию*, звычайным для рэлігійных помнікаў старабеларускага пісьменства: възрить на женоу съ похотию; коею властию сіа твориши; съ радостію приемлет; Ѧко покаашасѧ пропов҃ѣдию иониною; видѣша отроча съ мриею мтерію его.

У месным склоне назоўнікі мужчынскага, ніякага і жаночага родаў выступаюць з канчаткам *-ѣ/-и* (адпаведна з цвёрдай і мяккай асновай): *м.р.:* създа храминоу свою на пѣсцѣ; гонѧт҃ вы въ градѣ семь; имоущи въ чревѣ; при корени древа лежить; не ѡ хлѣбѣ единѡм живь боудет члкь; въ корабли; ѡ іоан҃нѣ крстли рече; *н.р.:* бръвно въ оцѣ твоем; създа храминꙋ свою на камени; сѣдѣаше при мори; въ срдци своемь; въ црствіи нбснѣмь; *ж.р.:* відѣ члка на мытници сѣдѧща; видѣша отроча съ мриею мтерію его; въ поустыни; сѣдѧщіи въ тмѣ; сѣдѧщіим въ странѣ, и сѣни смрьтнѣи; ѡбѣситсѧ жрьновь … на выи егѡ. Канчатак *-у* маюць у месным склоне назоўнікі мужчынскага роду з былой асновай на *и*: лежить въ домоу ѡслаблень; бис емоу възлежащоу въ домоу.

У Слуцкім Евангеллі шырока прадстаўлены традыцыйныя формы клічнага склону мужчынскага, жаночага і ніякага родаў: *м.р.*: рече емꙋ, оучтлю; пѡмилоуи ны ісе сне давыдовъ; *ж.р.:* дръзаи дщ҃и; ѡ жено, веліа вѣра твоѧ; н.р.: дръзаи чад*о*.

**ІІ. Множны лік.**

Назоўнікі мужчынскага роду ў назоўным склоне аформлены з дапамогай традыцыйных канчаткаў: 1) *-и*: лицемѣри творѧть въ сонмищахъ; вьноутрь же соуть влъци хищници; въслѣд его идѧхоу нарѡди мноѕи; юньци мои оупитаннаѩ; мѣси погыбноуть; пристоупиша к немоу оучници его; 2) *-ове*: сынове же црствіа изгнані боудоуть въ тьмоу;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свобо*д*ни соуть снове; 3) *-е, -ие*: мноѕи мытаре и грѣшници прише*д*ше; цѣли ꙗко голоубіе; бѣста бо рыбарѣ; мытаре же и любодеица вѣроваша емоу; оуча ихь ꙗко власть имѣа, и не ꙗко книж$^s$ници и фарисѣе; дѣлателе … решѧ.

Адзначым, што канчатак *-и* ў гэтай пазіцыі ўласцівы помнікам рэлігійнага пісьменства: въслѣ*д* его идѧхоу нарѡди мноѕи.

Назоўнікі ніякага роду ў назоўным склоне зафіксаваны з канчаткам *-а*: въстаноуть чѧда на рѡ*ди*телѧ; лица и*х* обраѕ и смѡтреніа сна бжіа. Назоўнікі з асновай на зычны (*тело*) выступаюць з суфіксам *-ес-*: многа тѣлеса оусопши*х* стыхъ въсташѧ. Увогуле ж для старабеларускага пісьменства такія формы не былі характэрнымі і з'яўляліся ў помніках пад царкоўнаславянскім уплывам.

Назоўнікі жаночага роду ў назоўным склоне выступаюць з канчаткам *-ы*: Бѣхоу же тоу и жены многы; и сестры его не въ насъ соу*т*; се мти твоѧ, и братіа твоѧ, и сеьстры твоѧ.

У родным склоне назоўнікі мужчынскага роду зафіксаваны ў старажытнай форме з нулявым канчаткам: Неціи ѿ книжникъ, рѣш*а* въ себѣ; ѿ*т*вѣщаша нѣціи ѿ*т* к$^s$нижни*к* и фарисѣи; престоупають преданіа старець; ризоу свою ѿ*т* власъ велб$^s$оуж*д*ь. Такія формы не былі характэрнымі для старабеларускай мовы, пра што сведчыць нязначная колькасць падобных прыкладаў у пісьмовых крыніцах.

Назоўнікі ніякага роду ў родным склоне традыцыйна выступаюць з нулявым канчаткам: вѣтви ѿ*т* дрѣвь; ни оць вашь нбсныи оставить вамь съгрѣшеніи ваши*х*; ѿ*т* словесъ свои*х* ѿсоудишисѧ; малѣише е*с* ѿ*т* в$^s$сѣ*х* сѣмень; плачѹщисѧ чадъ свои*х*.

У родным склоне назоўнікі жаночага роду таксама прадстаўлены з нулявым канчаткам: снѣдаете домы вдовиць; мнозѣ*х* птиць лоучши есте вы; не оумывают бо роукъ свои*х*; ѱи ꙗдѧть ѿ*т* кроупиць.

У давальным склоне назоўнікі мужчынскага роду прадстаўлены з традыцыйным канчаткам *-омъ/-емъ*: ѿ*т*поущаете члкѡ*м* съгрѣшеніа ихь; запрѣти вѣтромъ; давшаго власть таковоу оученикѡ*м*; мытаремь дроугь и грѣшникѡ*м*; ѿ*т*крылъ еси та младен$^s$це*м*. З канчаткам *-амъ* зафіксаваны назоўнік *слуга*: тъгда рече црь слоуга*м*.

Назоўнікі ніякага роду ў давальным склоне выступаюць з канчаткам *-емъ*: пѡ*до*бень есть дѣтище*м* сѣдѧщіи*м*$^s$ на тръжищи*х*.

Назоўнікі жаночага роду ў давальным склоне маюць старажытны канчатак *-амъ*: пріити птица*м* нбснымь; по вода*м* пріити.

У вінавальным склоне назоўнікі мужчынскага роду прадстаўлены пераважна старажытнымі формамі з канчаткам *-ы* (пры цвёрдай аснове): цѣлѹете дроугы ваша; из$^s$гна дѹхы словѡм$^s$; прѣ*д* вл*д*кы же и црѧ веден; оставль народы; призававъ оучнкы своѧ.

Назоўнікі ніякага роду ў вінавальным склоне выступаюць у формах, адпаведных формам назоўнага склону, з канчаткам *-а*: всѧкь слышаи



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

словеса моѧ сии; ѡ*т*поущаете члкѡ*м* съгрѣшеніа ихь; видѣвь іс помышленіа ихъ.

Формы вінавальнага склону назоўнікаў жаночага роду супадаюць з формамі назоўнага склону (выступаюць з канчаткам *-ы/-и*): въ мѧкъки ризы обльчена; отиде въ страны тѵрьскыа; затворивъ двери твоѧ; вамѕ есть дано вѣдѣти таины цр*с*твіа бжіа; повѣлѣ ва*м*ѕ поустити жены ваша.

У творным склоне назоўнікі мужчынскага роду прадстаўлены формамі, якія супадаюць з формамі назоўнага склону: възлежахоу съ ісомъ и съ оучникы его; почто съ мытари и грѣшникы оучтль вашь ꙗсьть и пьеть.

Назоўнікі жаночага роду ў творным склоне выступаюць з традыцыйным канчаткам *-ами/-ями*: ни помѣтаите бисеръ ваши*х* пре*д* свиньꙗми; не попероуть и*х* ногами своими; покрыватисѧ … притчами.

У месным склоне назоўнікі мужчынскага роду зафіксаваны з канчаткам *-охъ*: Сеи же мѧккаа носѧть въ домѡ*х* цр*с*кыхь соу*т.*

Назоўнікі ніякага роду ў месным склоне прадстаўлены з традыцыйным канчаткам *-ехъ/-ѣхь*: поꙗсъ оусмѣнь о чрѣслѣхь свои*х;* по десѧтихъ лѣтехь; е*с* на нбсе*х.* Спарадычную фіксацыю маюць формы з канчаткам *-ахь:* лицемѣри творѧть въ сонмищахъ.

У месным склоне назоўнікі жаночага роду выступаюць з канчаткам *-ахъ*: приходѧть к ва*м* въ одежда*х* ѡвчахъ; въ притча*х* глю имь.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Булыка А.М. Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко. – Мн. : Навука і тэхніка, 1979. – 328 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ